Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
___________________А.І.Жук
"___"_____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ТД-____/тып.

# АСНОВЫ КАМПАЗІЦЫІ

## Тыпавая вучэбная праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады напрамку 1-17 03 01-02 камп'ютарная музыка

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення навучальных устаноў і кадраў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
______________Е.У. Рыбчынская
"____"_____________2012 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________Ю.І. Міксюк
"____"___________2012 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў
_____________ Б.У. Святлоў
"___"____________2012 г.

Рэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы"
____________У.І. Жупляк
"____"___________2012 г.

Эксперт-нормакантралёр
___________ _________
"_____"_____________2012 г.

Мінск 2012

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*А.В. Цапко*, выкладчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты**:

*кафедра* кампазіцыі ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*В.В. Кузняцоў*, загадчык кафедры інструментоўкі УА “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, прафесар.

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой**:

кафедрай мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №7 ад 12.04.2012г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

навукова-метадычным саветам па мастацтве музыкі Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў.

Адказны за рэдакцыю ________________
Адказны за выпуск А.В. Цапко

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тлумачальная запіска

«Асновы кампазіцыі» – адна з прафілюючых дысцыплін для студэнтаў спецыяльнасці “Мастацтва эстрады” напрамку “камп’ютэрная музыка”, у межах якой на практыцы вывучаюцца законы будовы музычных твораў і прынцыпы музычнай драматургіі. Майстэрства кампазітара грунтуецца на тонкім адчуванні гэтых законаў, на ўменні пабудаваць музычны твор адпаведна ім. Найбольш поўна адпаведны вопыт прадстаўлены ў розных жанрах і формах твораў такіх як акадэмічнай, джазавай і рок-музыкі.

Стварэнне музычнага твора як мастацкага цэлага мае на ўвазе веданне і аналіз шэрагу пытанняў. Гэта пытанні стылю, жанру, музычнай формы, вобразнага зместу, музычнай драматургіі, гармоніі, поліфаніі, фактуры і г.д. Таму дысцыпліна “Асновы кампазіцыі” ўваходзіць у комплексную падрыхтоўку студэнтаў напрамку “камп’ютарная музыка”, цесна ўзаемадзейнічаючы з такімі спецыяльнымі дысцыплінамі, як “Поліфанія”, “Аналіз музычных формаў”, “Інструментазнаўства, аранжыроўка і пераклад музычных твораў”, “Камп’ютарная аранжыроўка” і інш.

Мэтай дысцыпліны «Асновы кампазіцыі» з’яўляецца засваенне на практыцы асноўных законаў будовы музычных твораў, а таксама развіцця музычнай думкі. Дысцыпліна ахоплівае асноўныя формы акадэмічнай музыкі: ад перыяду да варыяцый і ронда, уключае асноўныя кампазіцыйныя формы джазавай і рок-музыкі, якія часцей за ўсё выкарыстоўваюцца на эстрадзе. Улічваючы спецыфіку спецыяльнасці, у змест дысцыпліны не ўключаны такія формы, як санатная і санатна-сімфанічны цыкл.

Мэта курса абумоўлівае выкананне наступных задач:

- ствараць музычныя творы малых і буйных форм для розных інструментальных і вакальных складаў;
- аналізаваць розныя музычныя творы з пункту гледжання іх формы, драматургіі, сродкаў выразнасці і тэматычнага развіцця;
- увасабляць ў ствараемых музычных творах драматургічныя прынцыпы кампазіцыі буйнейшых кампазітараў свету.

У выніку вывучэння дысцыпліны «Асновы кампазіцыі» студэнт павінен **ведаць**:

- агульныя правілы музычнай кампазіцыі;
- правілы стварэння музычнага твора;
- прынцыпы стварэння музычных твораў малых формаў вакальнай музыкі;
- прынцыпы стварэння музычных твораў малых формаў інструментальнай музыкі;
- правілы пабудовы музычнай кампазіцыі простай двухчастковай і простай трохчастковай музычных формаў;
- правілы пабудовы музычнай кампазіцыі складанай двухчастковай і складанай трохчастковай музычных формаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**умець**:
- ствараць музычныя творы малых формаў вакальнай, вакальна-інструментальнай і інструментальнай музыкі;
- карыстацца сродкамі музычнай выразнасці для ўвасаблення мастацкага вобразу ў музычным творы;
- выкарыстоўваць розныя прыёмы тэматычнага развіцця ў музычным творы.

Вывучэнне дысцыпліны “Асновы кампазіцыі” грунтуецца на трох метадычных тэндэнцыях. Першая з іх абумоўлена задачамі шматбаковага музычнага развіцця студэнтаў і прадугледжвае сістэматызаванае сачыненне твораў розных жанраў, формаў, стыляў для розных інструментальных і вакальных складаў. Другая тэндэнцыя праяўляецца ў засваенні студэнтамі неабходных тэхнічных навыкаў па прынцыпу “ад простага да складанага”. І апошняя абапіраецца на комплексны тэарэтычны аналіз будовы музычных твораў кампазітараў розных эпох і напрамкаў.

Агульная колькасць прадугледжаных тыпавым вучэбным планам гадзін – 290 г., з іх 124г. – індывідуальныя заняткі. Веды і практычныя навыкі студэнтаў кантралююцца ў працэсе навучання (залікі, экзамены), а таксама пры арганізацыі пазааўдыторнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Прыкладны тэматычны план**

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін<br>Індывідуальныя заняткі |
|---|---|
| ***Тэма 1.*** Уводзіны. | 1 |
| ***Тэма 2.*** Перыяд. Складаючыя перыяду: сказ, фраза, матыў. | 12 |
| ***Тэма 3.*** Простыя формы (дзвухчастковая, трохчастковая) | 21 |
| ***Тэма 4.*** Складаныя формы (дзвухчастковая, трохчастковая) | 24 |
| ***Тэма 5.*** Варыяцыі (Строгія, вольныя) | 16 |
| ***Тэма 6.*** Ронда (старыннае, класічнае) | 16 |
| ***Тэма 7.*** Сюіта | 13 |
| ***Тэма 8.*** Формы і жанры поп-музыкі | 21 |
| **Усяго:** | **124** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Змест дысцыпліны

### Тэма 1. Уводзіны ў кампазіцыю

Мэты і задачы курса. Сутнасць музычнай кампазіцыі. Сродкі музычнай выразнасці як інструментарый кампазітара. Паняцце аб музычнай драматургіі. Тыпы выкладання музыкі. Законы будовы мелодыі і гармоніі. Тыпы фактуры. Выразная і драматургічная роля тэмбра.

### Тэма 2. Перыяд

Паняцце перыяду. Складаючыя перыяду: сказ, фраза, матыў. Перыяд квадратнай і неквадратнай, паўторнай і непаўторнай будовы. Аднатанальны і мадулюючы перыяд. Дапаўненне і пашырэнне перыяду. Перыяд адзінай будовы.

Аднагалосая мелодыя ў форме перыяду. Мелодыя з акампанементам у форме перыяду. Тэма.

### Тэма 3. Простыя формы

Паняцце аб простых формах. Кантрастныя і некантрастныя формы. Рэпрызныя формы. Простая двухчастковая форма. Простая трохчастковая форма.

### Тэма 4. Складаныя формы

Паняцце аб складаных формах. Складаная двухчастковая форма. Складаная трохчастковая форма. Трыо і развіваючая сярэдзіна. Ступень і тып кантрасту ў сярэдзіне.

### Тэма 5. Варыяцыі

Паняцце аб вар'іраванні. Віды вар'іравання. Варыяцыі як музычная форма. Варыяцыі на адну тэму і варыяцыі на некалькі тэм. Спалучэнне варыяцый з іншымі формамі.

### Тэма 6. Ронда

Паняцце аб форме ронда. Рэфрэн і эпізоды. Спалучэнне ронда з іншымі формамі, ронда-саната.

### Тэма 7. Сюіта

Паняцце аб форме сюіты: цыклічнасць, выкарыстанне танцавальных жанраў. Прынцыпы сапастаўлення частак у сюіце. Спецыфіка старадаўняй сюіты.

### Тэма 8. Формы і жанры поп-музыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Куплетная форма. Спецыфіка выкарыстання куплетнай формы ў жанрах папулярнай музыкі. Рэгтайм. Блюзавы квадрат. Выкарыстанне прынцыпаў акадэмічнай кампазіцыі ў жанрах поп-музыкі і рок-музыкі. Спецыфіка сачынення электронных музычных твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Инфармацыйная частка
### *Літаратура*

**Асноўная**


1. *Гнесин М. Ф.* Начальный курс практической композиции / М. Ф. Гнесин. – М.: Музгиз, 1962. –162с.
2. *Муха А.И.* Процесс композиторского творчества / А. И. Муха. – Киев: Музична Украина, 1979. –89с.
3. *Тараканов М.Е.* Замысел композитора и пути его воплощения: Сб. «Психология процессов художественного творчества» – Л.: Наука, 1980. – 68с.
4. *Чугунов Ю.Н.* Эволюция гармонического языка джаза / Ю. Н. Чугунов. – М.: МГИК, 1994. –115с.
5. *Месснер Е.И.* Основы композиции / Е. И. Месснер. – М., 1968. –290с.
6. *Маркин Ю.И.* Джазовый музыкальный словарь / Ю. И. Маркин. – М., 1985. –388с.


**Дадатковая**


1. *Гаранян Г.* Аранжировка для вокально-инструментальных ансамблей / Г. Гаранян Г. - М.: Музыка, 1987. –237с.
2. *Зарипов Р.Х.* Кибернетика и музыка / Р. Х. Зарипов. – М.: Наука, 1971. – 12с.
3. *Петрушин В.И.* Музыкальная психология / В. И. Петрушин. – М.: Пассим, 1994. –58с.
4. *Саульский Ю. С.* Аранжировка для биг-бенда / Ю. С. Саульский. М.: Композитор, 1998. –152с.
5. *Мелехин В.П.* Универсальные принципы развития импровизации / В. П. Мелехин. – МГУКИ, 2002. –166с.


### Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і выкарыстуецца комплексна.

1. Творчыя заданні прадугледжваюць аналіз музычных твораў
2. Сачыненне музычных твораў розных жанраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ